# Большая і менш зрусіфікаваная

Мая бабка, калі я запытаўся ў яе пра 17 верасьня, сказала мне: “Людзі радаваліся, што прыйдуць расейцы, а ня немцы”.

Палякаў не перастае зьдзіўляць русафільства беларусаў. Пры гэтым яны забываюцца, а хутчэй за ўсё проста ня ведаюць, што ў Расейскай імпэрыі беларусы былі часткай паноўнага народу. Расейскі народ паводле афіцыйнай тэорыі падзяляўся на тры галіны: вялікарускую, малярускую (украінскую) і беларускую. Ён быў трыадзіны, як Сьвятая Тройца. Саветы адкінулі Сьвятую Тройцу, але прынцып заняцьця ўсіх важных пасадаў прадстаўнікамі гэтых трох усходнеславянскіх нацыянальнасьцяў захавалі. Аднак яны мусілі лічыцца з абуджанымі памкненьнямі беларусаў і ўкраінцаў. Яны спрабавалі задаволіць іхнае адчуваньне ўласнай дзяржаўнасьці падзелам на савецкія рэспублікі. Можна пацiснуць плячыма ад такой”дзяржаўнасьці”. Аднак іншай не было. Можна сумнявацца ў вартасьці аб’яднаньня Саветамі ў 1939 г. беларускага народу. Але хто іншы мог гэта зрабіць? І якая пэрспэктыва чакала падзелены беларускі народ? У Польшчы — палянізацыя. Да 17 верасьня ў Польшчы не было аніводнай беларускай школы і нават газэты. У СССР, вядома, русіфікацыя.

Цаной аб’яднаньня былі сотні тысяч ахвяраў сталінскага тэрору, забітых і дэпартаваных. Аднак праўда і тое, што гэты тэрор у большай ступені закрануў габрэяў і палякаў, чым беларусаў. Таксама як і гітлераўскі тэрор, якога наагул не было б без вайны, у першую чаргу быў скіраваны супраць габрэяў, і толькі потым супраць беларусаў.

Мне нялёгка разважаць у катэгорыях вялікіх лічбаў. У прапарцыйна меншай колькасьці забітых беларусаў зьмяшчаюцца трое братоў майго дзеда. Тым ня менш, цяпер колькасьць беларусаў у Беларусі вырасла з 70% перад вайной да 80%. Беларусь зь сельскагаспадарчага краю пасьля вайны ператварылася ў найбольш эканамічна разьвітую рэспубліку Савецкага Саюзу. Палякі прызвычаіліся думаць пра беларусаў як пра народ калгасьнікаў. Тым часам на вёсцы жывуць і працуюць толькі 30% жыхароў Беларусі, гэта значыць менш, чым у Польшчы. 70% жывуць у гарадах, а Менск большы за Варшаву.

У беларусаў ёсьць туга па Вялікай Айчыне, у якой яны былі маршаламі, міністрамі і касманаўтамі Імпэрыі. Цяпер яны таксама зусім ня хочуць расейцам служыць. Прэзыдэнт Лукашэнка хоча імі кіраваць, а менш амбітныя маюць надзею, што дурныя маскалі прынамсі напаўдарма сагрэюць ім кватэры. Лукашэнка ня мусіць да нечага беларусаў змушаць. Ён толькі спрабуе споўніць іхнія мары. Аднак сумнеўна, што яму гэта ўдасца. Беларусы вылечаць свой імпэрскі комплекс хутчэй, чым расейцы.

Незалежная беларуская дзяржава, нягледзячы ні на што, існуе. Падрастае пакаленьне, для якога яна — адзіная вядомая рэчаіснасьць. Карысьці ад аб’яднаньня з Расеяй штосьці ня бачна, таму папулярнасьць прэзыдэнта падае нават у афіцыйных рэйтынгах. Цяпер яна складае крыху больш за 50%. Ніжэй афіцыйна яна ўпасьці ўжо ня можа. На першым прэзыдэнцкім рэфэрэндуме за бел–чырвона–белы сьцяг і выключнасьць беларускай мовы ў якасьці дзяржаўнай і супраць аб’яднаньня з Расеяй выказаліся каля мільёну дарослых жыхароў Беларусі, гэта значыць кожны сёмы. Другі рэфэрэндум прэзыдэнт мусіў сфальсіфікаваць, таму невядома, колькі беларусаў падтрымлівае ягоную палітыку, а колькі — не. Тыя, хто супраць, пакуль што пішуць толькі на мурах “маскалі — дахаты”. У гэтым нібыта нічога і няма, але некалькі гадоў таму такі лёзунг было цяжка сабе ўявіць. Беларусы сапраўды ня мелі нічога супраць расейцаў.

Ня ведаю, калі ў Беларусі дойдзе да пераломy. Як гісторык магу сказаць толькі тое, што ў пачатку нашага стагодзьдзя ніхто нават ня марыў пра беларускую дзяржаву. Пад канец стагодзьдзя беларуская дзяржава існуе. Калі б не 17 верасьня, то яна, можа, таксама існавала б, але амаль удвая меншая і яшчэ больш зрусіфікаваная.

*Друкуецца паводле:*
Tygodnik Solidarności. 1997. №41. S. 15.